№ 41 Ausgabe B.

# ГОМАН

Цэна с перэсылкай і дастаукай да хаты:

на 1 год—4 м. 80 фэн., на ½ году—2 м. 40 ф., на 3 месяцы—1 м. 20 ф., на 1 мес.—40 фэн.

Беларуская Віленская часопіс

выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Адрэс рэдакцыі: Вільня, Віленская 33.
Адрэс адміністрацыі і экспэдыцыі: М. Стэфанская 23.

Цэна абвестак:

на 4-ай старане за радок дробнымі літэрамі — 25 фэніг.; дробные абвесткі — па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці — 60 фэн. за лінейку дробн. друкам

№ 41 (237). Год III. Вільня, 22 мая 1918 г. Цэна 5 фэн. (3 кап.)

## 21 мая.

**Заходні тэатр:**

Кэмэль і ўчора служыў ізноў за мэту сільных штурмаў ворагаў. Яны крывава адбіты, і зашчытнікі Кэмэля мелі поўную ўдачу. На фронці Бурмэцэль, на заходзі ад Драпгутэр, пасьля найсільнейшай артылерыйскай падгатоўкі пачалíся пешые штурмы. Некалькімі хвалі ішлі ўпярод францускіе войскі. Агнём пяхоты і артылеры мы зламалямі іх штурмы і адбілі, учыніўшы ў іх цяжкіе шкоды. Дзе ворагам удавалося ўварвацца на нашу пярэднюю лінію, яны былі выкінуты контратакай. На ўсходзі ад Лёкр ворагі яшчэ ўдзержаліся ў адным мейсцы. Паводлуг апавяданьняў палонных, англіцкіе дывізіі стаялі на трэйцяй лініі, але с прычыны поўнай неўдачы французаў не былі пушчаны ў ход. У вечары і ў начы артылерыйская бітва дайшла найвялікшай сілы. Новые варожые штурмы з Лёкр у вечары адкінуты.

---

За апошніе тры дні зьбіты 59 варожых самалётаў і 3 прывязные лятучые шары.

---

КІЕЎ. Гэтман Скоропадзкі быў 19 мая разам з нямецкім, аўстрыяцкім і баўгарскім прэдстаўнікамі пры адкрыцьці украінскага клюбу, каторы ёсьць таварыствам літэратуры і штукарства. Гэтман Скоропадзкі ў мове сказаў, што глаўная яго задача—гэта стварыць дужую незалежную Украіну на демократычных асновах, ды ён маніцца ісьці поруч з украінскім народам. Іншые аратары дзякавалі Нямеччыне за адбудову Украіны і жадалі самага цеснага лучэньня з Нямеччынай, каторай вельмі шмат абавязаны у культурным, навуковым і тэхнічным адношэньні. Нямецкі пасол барон Мумм меў мову, каторую скончыў словамі: „Нехай жыве, расьце і красуе украінскі клюб і Украінская Дзержава! Глаўная задача маладой рэспублікі—гэта сьпешная украінская культурная палітыка і перш-на-перш будаваньне нацыональнае украінскае школы.

КІЕЎ (В.Т.Б.). Соцыал-фэдэраліст Шульгін быўшы міністэр справядлівасьці ў габінэце Голубовіча назначэны маршалкам украінскай дэлегацыі для вядзеньня перэгавораў аб міры з Расеей.

КІЕЎ. (В.Т.Б.). Архіепіскоп Антоні Харкаўскі выбраны мітрапалітам Украіны. Ен быў раней архіепіскопам у Жытаміры.

ПАРЫЖ (В.Т.Б.) (Гавас). публікуе ноту, у каторай між, іншым, кажыцца: Францыя запрапанавала швэйцарскаму ўраду 85 тысяч тонн каменнага вугалья па 150 франкаў за тонну. Швэйцарскі ўрад уступіў перад нездаволеньнем нямецкага ўраду і зрабіў умову з Нямеччынай аб дастаўцы вугалья. Мы паведамілі швэйцарскі ўрад, што калі Нямеччына скарыстае с свайго палажэньне, каб аслабіць сувэрэнітэт Швэйцарыі, што зробіць свой уплыў і на нас самых, дык мы будзем прымушаны бараніць нашые інтэрэсы. У кожным здарэньні мы і на далей астанёмся прыяцелямі швэйцарскага народу і, каб давесьці гэта мы будзем даваць Швэйцары і далей вугальле, канечна патрэбнае, для прэдпрыемстваў, каторые працуюць у Швэйцары для нас і нашых саюзьнікаў.

ВЕНА. Аўстрыяцкае ўрадовае спісаньне законаў абвешчае загад аб раздзяленьні Чэхіі на нацыональные паветы. На чале кожнага павету ёсць паветовы начальнік, каторы выпаўняе павіннасьці намесьніка. Прага з ваколіцамі абымаючая 600.000 жыхараў творыць апрычоннае намесьніцтва. Паветовые начальнікі (намесьнікі) ёсць органамі адміністрацыі другой ступені.

ШТОКГОЛЬМ. Адзін рускі параход з 8-ма тысячамі уцекачоў мужчын, жонак і дзяцей найшоў на міну і затануў.

БАЗЭЛЬ. „Гавас“ З Лёндону наказываюць, што ўсяго арэштавано 500 ірляндцаў. Між імі ўсе члены парлямэнту, належачые да партыі сін-фэйнэраў. Дэвалера высланы на ваенны карабель.

БЭРЛІН. Урадовая «Nord Deut. Allg. Ztg.» наказывае, што заява венгерскай газэты „Az. Est.“ быццам канцлер Бэтман Гольвх гатоў быў аддаць „маленкую часць“ Лётарынгіі непраўдзіва: Нямецкі ўрад ніколі не згаджаўся уступіць і малую часць імперскай зямлі.

ЖЭНЕВА. Парыжскі карэспандэнт «Manchester Gwardian», Дель, каторы пусьціў фальшывую вестку аб пісьме аўстрыяцкага імпэратара аб уступцы Трыесту ў замену на Сілезію, загадам францускага ўраду выдален с Францыі.

ВАШЫНГТОН (Рэўтэр). Макаду пазволіў асыгнаваць мільярд доляраў на будоўлю сёлета чыгунак.

ЛОНДОН (Рэўтэр). Міністэр еміных спраў, лёрд Ронда, на жаданьне Льлёйда Джорджа ўзяў сваю адстаўку назад.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Конгрэс нямецкіх ваенных саюзаў на сваім апошнім заседаньні прыняў рэзолюцію, каб у будучыне кожын нямецкі ваенны, незалежна ад партыйнай прыналежнасьці, мог быць прынят у чысло членаў гэтых саюзаў.

ЛЮГАНО. „Corr. d. Sera“ наказывае з Н'ю-Іорку, што італьянскі лятун Рэньяті зваліўся с самалётам сыстэмы Копроні на эрадроме ў Гэмстэід і заліўся на сьмерць. Рэн'яті ў лістападзе 1917 году паднёсься на сваім самалёці з 25 асобамі ўверх на 17.000 локцяў. Ен апрацаваў плян пералёту над Атлянтыцкім акіанам.

---

# Незалежная Беларусь.

**Мэморыал нямецкаму паслу пры Украінскім урадзе.**

Сёлета 25 красавіка Беларускай дэлегацией у Кіеве быў пададзены нямецкаму паслу пры Украінскім урадзе мэморыал падпісаны Александрам Цьвікевічам, проф. В. Доўнар-Запольскім і дкр. П. Трэмповічам. У мэморыале гэным між іншым кажыцца:

«Праца беларускага народу над стварэньнем свайго ўраду магла праявіцца дзеля варункаў ваеннага часу пазьней, чымся гэткая-ж праца на Украіне. Але жаданьне стварыць незалежны гасударственны організм было заўсёды вялікае сярод кіраўнічых беларускіх партый, бо гэта тэндэнцыя асновывалася на прыродным жаданьні народных мас. Пачуцьцё дзержаўнасьці глыбока ўкарэнено ў панацьце беларускага народу, бо яно асновываецца на яго гісторыі, этнографіі, мове і на супольнасьці экономіцкага ладу. Не кажучы аб слаўнай незалежнасьці гасударственнага жыцьця старасьвецкага перыоду, прыпомнім, што ў сярэднявяковы перыод яго гісторыі, да 1569 г. Беларусь была незалежным гасударствам з гасударамі літоўскай дынасьціі, а с 1569 г. да 18 веку складала фэдэратыўную часць Рэчы Паспалітай, аднак карыстаючы на сваёй зямлі сувэрэнным правам. Уласць Расеі не зьніштожыла ў беларусах пачуцьця гасударственнай самабытнасьці, і ў 1830 і 1863 гадох беларусы не тольکі інтэлігенцыя, але і народ прынялі учасьце ў паўстаньні проціў Расейскага ўраду, б'ючыся за волю Бацькаўшчыны. Настаўшые далей гады цяжкога ўціску зьнішчылі беларускую літэратуру, інтэлігенцію, але ў народзе ня зьнішчылі пачуцьця дзержаўнай самабытнасьці. Злучэньня народных беларускіх мас з Расеей не магло быць між іншым дзеля таго, што беларускі народ па сваёй культуры заўсёды належыў да народаў заходня эўропэйскіх, а не да ўсходу. Вышэйшые клясы жыхараў, пры гэтым вельмі чысьленные і цяпер злiўшыеся найбольш з народнай масай, карысталі шырока разьвітым конституцыйным правам, а чысьленные месты мелі нямецкае права.

З экономіцкага боку гэта край, з 12 мільёным беларускім насяленьнем, не багаты прыродай, але мае добра разьвітые і культурные гаспадаркі,—лясных і сельска-гаспадарскіх культур, у гэтым краю не бывае галадоў, ён мае экономічна трывалае селянства, маючае зямлю на гістарычна разьвітым у Беларусі праве ўласнасьці, ды селянства працавітае. У наш край заўсёды йшло шмат нямецкіх або анямечэных тавараў і ад нас ішла вялікая лічба ў Балтыцкіе порты дрэва, збожжа, скуры і інш.

Наш народ сваёй працавітасьцю дайшоў даволі вялікага дабрабыту, ня гледзючы на ціжар царскага рэжыму. Як апошні быў цяжкі для нас відаць с таго, што ў нашым краі было меней, чымся ў другіх школ, не было ніводнай вышэйшай школы і нічога не пазвалялося с 1863 да 1905 г. друкаваць у беларускай мове. І гэта дзеля таго, што царскі ўрад ведаў аб тэй цязе да самадзельнай дзержаўнасьці, каторая глыбока закладзена ў нашым народзе.

Цяпер гэтае пытаньне стало пякучым і ад Нямецкага Ўраду залежыць—ці паставіць яго ў добрае палажэньне і гэтым зьвярнуць сымпатыі нашага народу да Нямеччыны, або зьвярнуць сымпатыі і вочы нашага народу ў другі бок, можэ менш карысны для нямецкіх патрэб.

Каліб беларуская справа зацікавіла нямецкую палітыку, то конкрэтна мы зьвярнуліся б с свайго боку з гэткай пропозыцией:

1. Мы прасіліб прызнаць незалежнасць Беларусі і ўласць Рады і яе коаліцыйнага міністэрства.

2. Мы прасілі б устанавіць з мясцовымі нямецкімі ўласьцямі гэткіе адносіны, пры каторых наш Урад мог бы зарганізаваць свае сілы, каб устанавіць сваю ўласць у ўсходняй часьці Беларусі, цяпер занятай большэвікамі.

3. Разам з гэтым мы прасілі б аб захаваньні Беларусі ў яе прыродных гістарычных, этнографічных і экономіцкіх граніцах. Конкрэтна, мы будзем прасіць аб захаваньні за Беларусей Гарадненшчыны, цёку Прыпяці і м. Вільні».

**Паварот беларускіх дэлегатаў з Украіны.**

Народны сэкрэтар міжнародных спраў прызнаў патрэбным вызваць назад с Кіева дэлегатаў беларускага ўраду, С. Рака-Міхалоўскага і А. Цьвікевіча.

**Беларуска-Украінская граніца.**

Міжнародная камісія пры Радзе Беларускае Рэспублікі устанавіла пры учасьці спэцыялістаў беларуска-украінскую граніцу, каторай Беларускі Урад будзе дзержацца, вядучы перэговоры з Украінай.

**Дэлегацыя земстваў у Беларускім Народным Сэкрэтарыяце.**

13 мая да Беларускага Народнага Сэкрэтарыяту даведаліся прэдстаўнікі Рэчыцкага земства М. Мецельскі і Д. Гічык. Дэлегаты радзіліся с старшынёй Народнага Сэкрэтарыяту Я. Воронкай і народным сэкрэтаром асьветы А. Смолічэм аб справе, злучэнай з беларуска-украінскімі перэговорамі, а таксама аб справе організацыі сеткі беларускіх школ і ўвядзеньня

беларускай мовы ў школах ужо істнуючых.

**Новы Народны Сэкрэтарыят.**

Згодна с пастановай Рады Старэйшых утварэньне новага Кабінэту Беларускага Ураду—Народнага Сэкрэтарыату паручэно Р. Скірмунту. Пропозыціі ўвайсьці ў склад новага ўраду дасталі Я. Варонка, Я. Лесік, генэрал Кондратовіч, а таксама б. менскі мястовы галава, спэцыаліст у фінансавых справах п. Хжонстоўскі.

**Новы Прэзідзіум Рады Рэспублікі.**

Новы Прэзідзіум Рады Беларускае Народнае Рэспублікі, згодна с пастановай Рады Старэйшых будзе складацца: с старшыні А. Уласова, двох таварышаў А. Смоліча і С. Рака-Міхалоўскага і двох сэкрэтароў.

**У Радзе Беларускай Народнай Рэспублікі.**

У Радзе наладжэны гэткіе камісіі ў ніжэйпаказаным складзе:

*Камісія дзеля наказу*: 1) Варонка, 2) Смоліч, 3) Косьцевіч, 4) Серэда, 5) Аўсянік, 6) Цьвікевіч.

*Камісія дзеля міжнародных спраў*: 1) Варонка, 2) Аўсянік, 3) Крэчэўскі, 4) Лёсік, 5) Скірмунт, 6) Алексюк, 7) протоіерэй Кульчыцкі.

*Камісія фінансовая:* 1) Крэчэўскі, 2) Захарка, 3) Вернікоўскі, 4) Гадыцкі-Цэвірка, 5) Пашковіч.

*Камісія гаспадарская*: 1) Серэда, 2) Козіч, 3) Вернікоўскі, 4) Кузьміцкі 5) Немкевіч

*Камісія дзеля спраў уцекачоў*: 1) Бартош, 2) кс. Годлеўскі, 3) Ленкоўскі, 4) Прыстор, 5) Бадунова.

**Беларускі чырвоны крыж.**

З ініцыатывы групы беларускіх дзеячаў закладаецца Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа, каторае цяпер вельмі патрэбна.

**Беларускіе Сагайдакі («Бой-Скауты»).**

З ініцыатывы Менскае Вучаніцкае Грамады закладаецца новае культурна-асьветнае і спортыўнае таварыства беларускіх сагайдакаў, каторага мэта—фізычнае і маральнае гадаваньне пад клічам „Нехай жыве Незалежная Беларусь“.

## Новы габінэт.

Як мы ўжо пісалі, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі выявіла свой палітычны розум і палітычную сьпеласць прыняўшы рэзолюцію аб папаўненьні Рады прэдстаўнікамі ўсіх слаёў і ўсіх станаў беларускага народу ды прыцягнуўшы гэтак да палітычнай работы ўсе беларускіе чынные сілы. Пад штандарам незалежнасьці Беларусі згуртаваліся ўсе беларускіе партыі, ўсе кірункі. С таго мамэнту на Беларусі запанавала адна-ядыная палітычная ідэя, а ўсё тое, што дагэтуль раздзеляло беларусаў, адышлося на другі плян.

Але першы крок вымагае пасьледавацельна далейшых. Увайшоўшым у склад Рады новым сілам трэба было даць належнае мейсцэ дзеля творчай гасударственай працы. З гэтай думкай Рада і пастанавіла перастроіць свой спаўніцельны орган—Народны Сэкрэтарыат — на аснове коаліціі,—значыць, так, каб у ім былі прэдстаўнікі ўсіх кіраўнічых груп і партый.

У мысль пастановы Рады утварэньне новага ўраду даручэно вядомаму думскаму дзеячу, Раману Скірмунту. Аднак, гэтым не разрываецца зьвязь новага ўраду са старым, утворэным рэвалюцыйным спосабам і пратрываўшым тры месяцы: у чысле членаў габінэту занімае выдатнае мейсца першы галава першага беларускага ўраду і сэкрэтар міжнародных спраў, Язэп Варонка. Такім парадкам можна с поўнай верай сказаць, што палітычная лінія якая была намечэна на гістарычным заседаньні Рады Рэспублікі 25 марца 1918 г., будзе цьвёрда і нязьменна правадзіцца ў жыцьцё: незалежнасць Беларусі будзе і далей пуцяводнай зоркай беларускае дзержаўнае ўласьці. І мы перакананы, што ідучы гэтай дарогай новы габінэт сустрэціць паддзержку ўсяго беларускага народу, гэтак патрэбную ў момэнт барацьбы за незалежны і вольны быт нашае Бацькаўшчыны.

## Заходняя орыэнтація.

Усе беларускіе палітычные выступленьні як з гэтага, так і с таго боку фронту маюць адну цікавую рысу. Усе яны апіраюцца на натуральным экономічным і гаспадарскім цягаценьні Беларусі на Заход—да берагоў Балтыцкага мора, і з гэтага выплывае заходня эўропэйская орыэнтація беларусаў.

Орыэнтація гэта узмацовываецца яшчэ і ходам палітычных выпадкаў: палітычная Кон'юнктура прымушае беларусаў звертаць свае вочы перш за ўсё на Заход, адкуль яны могуць найболей спадзевацца прызнаньня незалежнасьці Беларусі і помачы ў будаваньні сваей дзержавы.

Само сабой ясна, што лучнасць з Заходам ня можэ астацца толькі на паперы—толькі ў офіцыальных зносінах. Беларусь, уваходзячы ў круг заходня-эўропэйскага жыцьця, гэтым самым прымушэна будзе дапасавацца да тых новых варункаў, якіе вытварацца на грунці зблізжэньня з Заходняй Эўропай. І перш за ўсё гэта ада'ецца на нашым экономічным жыцьці.

Як край перэважна сельскагаспадарскі, Беларусь будзе прымушэна праз доўгі яшчэ час апірацца на прадажы на заходня-эўропейскіх рынках свайго збожжа, а такжэ лесу. Мэтай народнай гаспадаркі будзе: даць чым-больш сваіх прадуктаў на продаж, — і з гэтым павінна быць зьвязана сельска-гаспадарская сыстэма. Ясна, што з гэтага вывікае патрэба такой развязкі найбольш палючых зямельных пытаньняў, каторая адпаведала бы новым вымогам жыцьця, — развязкі ў заходня эўропэйскім духу.

Узрост багацьця краю, развіцьце пакупной сілы жыхароў у хуткім часе створыць аснову і дзеля развіцьця краёвай прамышленасьці. І справа работніцкая, каторая ў часах прыналежнасьці Беларусі да Расейскай імперыі была ў зусім ненормальных варунках, знойдзе сваю развязку так сама ў духу і кірунку заходня эўропэйскім.

Адпаведна да соцыяльнай эволюціі, бязспорна, будзе адбывацца ў Бехарусі эволюція дзержаўнага жыцьця нашага краю. Формы гасударственага быту, які цяпер яшчэ толькі пачынае наладжывацца, яшчэ вельмі туманные, невыразные. Як яны ў канцы канцоў уложацца, цяпер яшчэ трудна сказаць: найляпей сьведчыць аб гэтым прыклад Украіны, а так сама тое, што робіцца цяпер у Фінляндзіі. А ўсё гэта і тут, і там вынікае с таго, што мы сказалі на самым пачатку: як гэтые землі, так і Беларусь, уваходзячы ў сыстэму заходня-эўропэйскіх дзержаў, ня могуць станавіць паміж імі дысонансу ці то с пагляду на свой соцыяльны, ці гасударствены лад.

*Х. Х.*

## На руінах Расеі.

Развал Расеі йдзе шыбкімі крокамі ўпярод. Адна за аднэй адпадаюць ад яе паняволеные некалі чужые землі, а палажэньне цэнтральнай Расеі—справядлівей Вялікарасеі—с кожным днём становіцца ўсё болей трагічным.

Вестак з Расеі цяпер, наагул, прыходзіць вельмі мала, і тые, што прыходзяць, ня суляць нічога добрага для вялікарусаў. Кожын, хто прыежджае з Расеі, апаведае аб поўнай экономічнай руіне гэтай яшчэ так недаўна багатай і магутнай староньні. Фабрыкі за малымі выключэньнямі не працуюць. Зямля—нявыраблена. І той край, каторы карміў сваім збожжэм чуць што ня поў Эўропы, стаіць сёлета напярадодні страшэннага, нячутага голаду: сёлетняга ураджаю далёка не хваце, каб пракарміць праз зіму і да новага збору ўвесь народ.

Каб зразумець, як гэта магло стацца, трэба кінуць вокам на агульнае палажэньне ў Расеі, якое тамака вытварылося пасьля рэвалюціі большэвікоў. Вядома, што перэварот быў організован людзьмі, каторые верылі, што ім удасца разьбіць стары соцыяльны лад і завясьці новы лад—соцыялістычны. Яны верылі, што, падняўшы народные масы, яны павядуць іх па намэчэнай дарозе і рукамі самога народу створаць новае жыцьцё. Але яны груба памыліліся: соцыялізм—гэта ідэал *організованага* грамадзкага жыцьця, гэта—найвышэйшая ступень організаціі грамадзянства, аб якой толькі можна падумаць. Перэдача ў рукі народу зямлі, фабрык, заводаў і ўсяе прамышленасьці магчыма толькі там дзе народ да гэтага культурна і грамадзка дасьпеў. І горкай іроніей выдаюцца словы *ідэйных* прэдстаўнікаў большэвізму, бытцым у Расеі, дзе 80% жыхараў — неграматны, гэтые цёмные, некультурные, дзікіе масы здалеюць павясьці грамадзкую гаспадарку — такую хітрую, што яна вымагае найлепшых галоў, людзей з навукай, спэцыалістаў. Каб весьці фабрыкі, патрэбны інжэнеры і іншые дазнаные ў гэтай рабоце людзі — так сама, як у арміі патрэбны афіцэры, прайшоўшые добрую школу. Большэвіцкая Расея спрабавала ваеваць без афіцэраў,—і яна разгромлена так, як бадай ні адна дзержава на сьвеці не была разгромлена. А як большэвікі ўзялі ў свае рукі ўсю прамышленасць, усе фабрыкі і заводы, дык і тут аказаліся самые сумные рэзультаты: фабрыкі ісьці ня могуць, закрываюцца адна за аднэй, і работнікі сотнямі тысяч астаюцца без працы і заробку. Тоеж сталося і на вёсцы: большэвіцкіе банды, каторые нічога супольчага з большэвізмам, апрача названьня, ня мелі, зруйнавалі ўсе двары, папалілі панскіе будоўлі, зніштожылі машыны, парэзалі скаціну ды дзеляць зямлю. Але тых вялізарных дворных абшараў, на якіе праз доўгіе гады прагавіта пагледалі расейскіе селяне, яны цяпер ня могуць вырабіць: німа чым, ані с чым. А аб якой колечы організованай працы на зямлі і ўспаміну німа: кожын стараецца адно толькі ўмацаваць за сабой чым-большы кусок ральлі „дзеля будучага часу“.

Вось, праўдзівы абраз палажэньня ў Расеі. Калі ў пачатку большэвіцкай рэвалюціі тамака і было некалькі дзесяткаў тысяч сьвядомых і добра організованых сацыялістаў, дык с таго момэнту, як рэвалюцыйны рух разварушыў многамільённые массы цёмнага народу, праўдзівые ідэйные большэвікі, растаялі ў гэных мільёнах, Іх цяпер не відаць. Затое выплылі наверх самые цёмные элемэнты, каторые ў каламутнай вадзе заўсёды любяць лавіць рыбу. На глухой правінціі уласць папала ў рукі людзей, каторые маюць на мэці толькі сваю асабістую карысць, хочуць толькі скарыстаць са здарэньня, каб пажывіцца чужым коштам „законным“ спосабам. І па ўсей Расеі йдуць грабежствы, раскраданьне і нішчэньне грамадзкага дабра, якое збіралося працай цэлых пакаленьняў і на якіх апіралася будучына Расеі.

Дарма большэвіцкі ўрад напружае сваю сілу, как завясьці нейкі лад. Дарма большэвіцкіе войскі б'юцца на Украіне, у Фінляндзіі, на Каўказе, стараючыся удзержаць цэласць гасударства. Развалу грамадзкага і гасударственага жыцьця Расеі большэвіком спыніць не удасца. А калі голад запануе па ўсей Расеі, калі большэвікі, каторые ўжо не маюць сілы ўцішыць разбушэваўшаеся народнае морэ, самі ўрэшці збанкроцяцця, дык Расея, праліўшы дарма цэлые рэкі крыві, вынішчыўшы вялікую часць свае інтэлігэнціі і сваё матэрыяльнае багацьце, лёгка можэ апынуцца „перад разбітым карытам“, і над руінамі яе пабедна будзе развевацца штандар *рэакціі*.

*Г. Б.*

## У Вільні і ваколіцах.

× **Крытычны час.** Дабрачынная і, наагул, грамадзкая праца ў Вільні ў часе нямецкай окупаціі развілася бадай выключна ў нацыональных організаціях. Кожная нацыональная група аддзелялася ў гэтай працы ад усіх, між імі вырастаў бытцым кітайскі мур, і толькі ў нялічных прыпадках мы бачылі спробу супольных грамадзкіх выступленьняў усіх краёвых нацыональнасьцей.

Гэта вельмі блага адбілося на жыцьці тых грамадзкіх і дабрачынных організацій, каторые пры самых сваіх заклядзінах сталі на грунце еднасьці ўсіх нацыональнасьцей. Толькі нялічные адзінкі не паддаліся незвычайна сільнаму узросту нацыоналізму і ня кінулі працаваць у іх. Але гэтые адзінкі маглі даваць ім толькі сваю асабістую працу, а таго, што становіць глаўны нэрв кожнага таварыства: грошы — яны даць не маглі.

Так, крытычные дні перэжывае залажыўшаеся яшчэ ў самым пачатку вайны „Таварыства лекарскай і еміннай помачы“, каторае ўжо некалькі гадоў утрымлівае ў Вільні безплатную амбуляторыю (В. Пагулянка 15), даючы помач доктарскай радай, лекамі і ў патрэбе прадуктамі (малако, крупы і інш.) бедным хворым бяз розніцы веры і нацыональнасьці. Сярэднім лікам, кожын дзень да амбуляторыі звертаецца каля 50 душ, ніхто не адыходзіць бяз помачы ці доктарскай рады. Цяпер Т-ва перэжывае востры фінансовы крызіс: запасы грошы, якіе яно мело ў момэнт прыходу немцаў, даўно разыйшліся, і толькі дзякуючы энэргіі прэзэса Т-ва, д-ра Шабада, насьпеўшы даўно крызіс удавалося адцягіваць з месяца на месяц. Справа ў тым што, нацыональные камітэты, ня гледзючы на тое, што амбуляторыя дае помач хворым усіх нацыональнасьцей, ніякай падмогі Т-ву не даюць, пазываючыся на тое, што яны могуць памагаць толькі організаціям сваей нацыональнасьці. Адзін с камітэтаў проста заявіў, што ён даўбы падмогу, але Т-ва павінно прыняць характэр, аднастайны з нацыональнасьцю гэтага камітэту...

На заседаньні ўраду Т-ва 17 мая з учасьцем вярнуўшагася ў Вільню старога члена і скарбніка яго, п. А. Булата, разгледалося пытаньне, як ратаваць Т-ва ад упадку. Будзем спадзевацца, што Т-ву яшчэ раз удасца выйсці з гэткага крытычнага палажэньня.

× **Местовая цэнтральная пекарня хлеба.** С прыны маючага адбыцця адкрыцьця местовай цэнтральнай пекарні, якая будзе выпекаць хлеб для ўсяго места, трэба адзначыць, што ў істнуючых цяпер пекарнях прадажа хлеба будзе адбывацца і далей, ды яго будуць у іх прывазіць с цэнтральнай пекарні. Новых пунктаў дзеля прадажы хлеба адкрываць ня будуць.

× **Ашуканства.** Па вуліцах ходзіць нейкая кабета і суліць цукер у мяшэчках па 10 фунтаў. „Шчасьлівы“ пакупец, прыйшоўшы да хаты, пераконываецца, што яго ашукалі: у мяшэчку цукер насыпан толькі зверху, а пад ім — жвір і г. п.

× **Кражы.** 13 мая на Ільнянай вуліцы украдзена белая, ў каштанавые плямы, карова.

У начы на 17 у ваколіцы Папоўшчына, сельскі павет Вільні, украдзен конь-буланчык 4 гадоў і цёмна-каштанавэе жэрэбя 1 году.

× **Тэмпэратура.** Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошніе дні была (па Цэльсію):

| | найвыш | найніж. |
|---|---|---|
| 16 — 17 | + 22,5° | + 7,0° |
| 17 — 18 | + 26,1° | + 6,6° |
| 18 — 19 | + 26,4° | + 7,0° |
| 20 — 21 | + 24,1° | + 9,5° |

# Афіцыяльны аддзел.

## Апавешчэньне.

На моцы вышэйшага загаду, гэтым загадываецца налажыць арэшт на ўсе кантрольные, рэгістрацыйные і запісываючые кассы ў межах местовага павету Вільні, а такжэ на іх машынэрыі і паадзінокіе часьці, калі яны зроблены цэлком або часьцю з медзі ці меднага сплаву (сьветлай і чырвонай медзі, томбаку, бронзы). Разам с тым гэтым прызываюцца ўсе валадзельцы кантрольных, рэгістрацыйных і запісываючых касс, іх машынэрыі і часьцей паказанага роду ў межах местовага павету Вільні заяўляцца дзеля рэгістрації у Stadthauptmanna, Домініканская 3, пакой 69, не пазьней 31 мая 1918 г. ад 8 да 1 і ад 4 да 8 гадз. Валадзельцы паказаных рэчэй з медзі ці меднага сплаву, каторые ў свой час ня споўняць гэтага загаду, павінны ждаць кары.

Вільня, 16 мая 1918 г.

Der Stadthauptmann
**Pauly.**

# З усяго Краю.

## З Менскага жыцьця.

У стацьці «Пасьля паводкі» менскі „Беларускі Шлях“ у № 30 гэтак апісывае палажэньне ў Менску:

Пусьцее Менск... С кожным днём усё радзей і радзей бачыш на вуліцы расейскую салдацкую шынэлю. Не так б'е ў вушы і варшаўская вымова крулевякаў, што саўсім недаўна была заліла нашае места. Чатыры гады ўжо, як апанавала Менск гэта хваля розных народаў і схавала ад сьвету дзеннага спраконвечных жыхараў беларускага Менску. З Масквы — вайсковые, з Варшавы ўцекачы. Адных і другіх аб'еднаў у сабе „Земсаюз“ і безканечные таварыствы помачы, сама-помачы і г. п. У фанэрных бараках злучыліся людзі дзьвёх варожых культур маскоўскай і польскай. Адзеўшы фрэнч, чырвоны крыж і монограму, альбо „ожэлэк“ яны дужа добра устроіваліся на пажыву каля сусьветнага торжышча, што адбывалося на беларускай зямлі.

Трэба праўду казаць, зарабілі і менчукі на гэтых саюзах і саюзьніках і зарабілі ня кепска. Горад вырас адразу без мала ўтрая. Паадчынялося, ня гледзючы на ваенны час, гэтулькі крамаў, прэдпрыемстваў, колькі было перад вайною. Але... Але дзякуй Богу, што гэта мінуло. З вялікай прыемнасьцю углядаюцца менчукі на поўные да верху цягнікі, што вывозяць ад нас чужынцаў — туды адкуль яны прыехалі. І патроху, аглядаючыся, вылазіць с пад фанэрных абломкаў, с пад зашчытных калёраў старое праўдзіва-беларускае абліччэ Менску. — Гэтак пасьля паводкі, як вада вернецца ў старые берагі, с пад пазастаўшага на залітай урерад сенажаці бруду вылазіць па троху сьвежая зялёненькая травіца. На памяць аб паводцэ многа яшчэ астаецца ўсякага ламачча, гнілога сітніку і балотнай травы. Але прыдзе гаспадар з жалезнымі грабелькамі, чысьценька зграбе ўсё ў кучу, высушыць, а пасьля спаліць — і попел разсеець па сенажаці.

Шмат і ў нас астаецца пакульшто памятак гэтай паводкі. Русіфікатары з «земсаюзу» захапілі ў свае рукі самауправы і асабліва заняты «прасьветай» беларускага народу. Сваіх пазыціяў у школі яны ні за што ня хочуць здаваць. Дый ці можа быць іначэй? Яны цяпер амаль што не «собиратели земли русской». Хтож апрача іх можа аднавіць тые ланцугі, якімі прыкула Масква да сябе «Западный край?» Хто будзе бараніць слаўные традыцыі Мураўёва, Шміта і Замыслоўскага, сьцерагчы рубяжы «всея Россіи» — Яны загадчыкі лазьняў і пральняў, уселякіе «заведующчые» і звычайные «земгусары». Тые, што ў пачатку вайны ў залатых пагонах насілі часам патрэты і крычалі «ура», у рэвалюцыю паначэплялі «настоящчій рубашэчный» кумач і цягалі на салдацкіе мітынгі «зямлю і волю», а цяперака выдаюць с сябе вельмі лойальных, дзелавых і патрэбных для краю людзей. Хутчэй хутчэй ніхай перарастае гэты мул маладая зялёная беларуская траўка.

У нядзелю каля касьцёлу так сама як і даўней, натоўп народу; шмат у каго «ожэлкі». Але натоўп саўсім другі. Дзе падзеліся крыклівые, надзьмутые мазуры? Усюдых лунае беларуская мова і з усіх бакоў глядзяць на цябе знаёмые тутэйшые твары. І гэта рэчка сходзіць у свае берагі. Толькі па ёй даўнейшая памяць будзе.

Калі с пад мулу праб'ецца першая зялёная травіца, дык разам з ёю павылазяць і нягодные травы, палыны ды крапівы. І доўга яны яшчэ расьці будуць і глушыць беларускі мурог. Але ня выжывуць пад простымі праменьнямі сонейка.

Усе гэтые чатыры гады палякі будавалі ў нас свае школы. Трэба за імі гэта прызнаць, што школы у іх — як раз такіе, як ім трэба. Беларускае дзіцянё з гэтай школы ці «ахронкі» (прытулку) ня выйдзе беларускім; мала надзеі каб яно і пасьля вярнулося да свайго народу — яго ўжо ахвяравалі Варшаве. А трэба сказаць, што ва ўсіх польскіх школах і да гэтага часу пераважывалі беларусы — каталікі; цяперака, як бежанцы з'едуць дамоў, астануцца адны дзеці нашых тутэйшых каталікоў, і яны ўсе будуць выгадаваны на палякоў. Расейскіе школы шмат школы прынесьлі беларускаму народу; але яны гэтак дрэнна пастаўлены, што па іх у душы дзіцяці аставаўся малы сьлед. А польская школа, арганізованая крулевякамі, будзе падтрымана тутэйшым спольшчэным грамадзянствам. Памятаючы ягелёнскіе запаветы, яно верна будзе служыць мачысе, дый проці роднае маткі. У гэтай справе аб'едноюцца ўсе палякі — і правые і левые, нават прыяцелі беларушчыны. І доўга яшчэ будзе гадавацца вялікая часьціна дзяцей беларускіх у романтычнай прывязанасьці да Польшчы чужаніцы, далёкай мачыхі, і ў пагардзе да свайго роднага, беларускага. І доўга яшчэ будзе часьціна маладзёжы нашай насіць на грудзёх лупежніка-арла замест радзімай пагоні.

Беларусам трэба будаваць школы і школы. Ні сіла духоўнай культуры нашых суседзяў, ні іх спадворная магутнасць не падаюць вялікага духа адраджэньня. Дух гэты ўжо ўходзіць у беларускіе школы, і ён нам створыць новы народ, які паверне сабе славу даўнейшых часаў сваей гісторыі. Тады не страшны будуць нам чужынцы. Аб часох іхняга панаваньня над Беларусьсю будуць расказваць як аб даўнай цёмнай мінуўшчыне. Вось, як цяпер аб часах паншчыны...

# Украіна.

КІЕЎ. Румынскі міністэр заграцічных спраў у ветлай, але цьвёрдай форме адкінуў пратэст украінскай рады с 13 красавіка проці прылучэньня Бэссарабіі да Румыніі. У той чацьвер тут з гэтай прычыны адбылася нарада ў міністэрстве заграцічных спраў пры учасьці прафэсароў міжнароднага права і быўшага міністра заграцічных спраў, Александра Шульгіна.

КІЕЎ. 16.V. Сягоньня падпісана фінансовая умова Украіны с цэнтральнымі дзяржавамі. Каб вярнуць сваю валюту, Украіна атрымала ад цэнтральных дзержаў пазыку 400 мільёнаў карбованцаў (рублёў) па курсу 1 марка=75 кап. і 1 крона=50 кап. Новые папяровые грошы друкуюцца ў Нямеччыне. Бумажкі якіе знаходзяцца ў абароці, будуць праз нейкі час узяты з абароту.

КІЕЎ. З'езд украінскай таргоўлі і прамысленасьці адкрыўся 16 мая. З'ехалося тысяча дэлегатаў, у тым ліку дэпутаты ад сялянскага саюза і саюза землеўласьнікаў. Заседаньне адкрыў міністр-прэзыдэнт Лізогуб. Міністр-таргоўлі, Гутнік, сказаў вялікую праграмную прамову, кажучы аб патрэбе аграцічыць гандэль гасударственым кантролем. Члены з'езду адзначывалі, што ў Донецкім басэйне узняліся вялікіе затрудненьні з работнікамі. Прэдстаўнікі рабочых дагэтуль ня йдуць на мір.

КІЕЎ (В.Т.Б.). Маршалак з'езду комэрсантаў прачытаў справаздачу аб палажэньні украінскіх чыгу-

*Францішк Олехновіч.*

# На Антокалі.

п'еса у 3 актах са сьпевамі і танцамі.

*АСОБЫ:*

ВІНЦЭНТ СЬЛІЖЫК, гаспадар шавецкай майстроўні на Антокалі.
МІХАЛІНА, яго жонка.
ЗОСЯ, іх дачка.
БАРБАРА, сестра Міхаліны.
ЯЗЭП ЖАЛЕЙКА, шавецкі чэляднік.
ІГНАТ РАДЗІВІЛЛОВІЧ, чыноўнік.
АНУФРЫ, зарубач.
АРОН, купец.
ПЯРОВІЧ, рэпортэр.
МАЦЕІХА.
АНТОНІХА.
ЯНОВАЯ.
РАФАЛ, гаспадар рэстарану.
КЭЛЬНЭР.
КЭЛЬНЭРКА.
ЖЭБРАК.
ЖЭБРАЧКА.
ПАЧТЫЛЬЕН.
ГАЗЭТЧЫК.
ГОСЬЦІ, МУЗЫКІ і інш.

**Рэч дзеецца некалькі гадоў назад.**
**Акт І і ІІ—ў кватэры Сьліжыкаў на Антокалі, акт ІІІ—ў Вэрках.**

## АКТ І.

**Пакоў у сутарэні, раздзелены пасярэдзіне паралельна з рамай пэркалёвай хвіранкай** на дроце. У глыбі сцэны 2 вокны на вуліцу і дзьверы с шклянными шыбамі. Над дзьверамі званочэк, каторы зьвініць, як толькі адчыняюць дзьверы. Між вокнамі стаіць бокам шафа з ботамі, раздзеляючы заднюю палову сцэны на 2 часьці: ў левай стаіць ложак, куфэрак і крэсла, ў правай — канапа, круглы столік, крэслы. На першым пляне, з левага і правага боку, дзьверы. З левага боку шавецкі варштат, каля яго круглые на 3-х ножках шавецкіе услончыкі. направа — абедзены стол, навокал яго простые, т. зв. „ведэнскіе“ крэслы. С правага боку пры сьцяне камода, з левага, напроці ў, этажэрка.

Як куртына адчынілася, хвіранка засунена. Пры варштаце сядзіць Язэп і ладзіць боты.

Паўза, ў часе каторай чуваць толькі Язэпаво клепаньне малатком па падошве ладжэнага бота.

### З'ява 1.

ЯЗЭП (пасьля паўзы).

Вось дык бот будзе! Трэба яшчэ выпуцаваць і канец!... Але калі ж, каб яго, мой майстра вернецца?! Пайшоў за інтэрэсамі і сядзіць гдзесь гэтулькі часу! Пэўне засеў гдзе у шынку і ані дбае! Меўся прынесьці шнуркі і воску — і не прыходзе! Бяз воску не магу пуцаваць, а боты трэба сягоньня кончыць.

(адкладывае бот, устае і пяе):

**Я шавец — маладзец,**
**Знаю дзела свае;**
**Слухаць мусяць мяне**
**Капылы і скур'ё.**

Я сам „крой“ намачыў,
На капыл нацягнуў,
„Стукі — стук!“ малатком
Шылам, дратвай мігнуў.

Падошву прылажыў,
Нагнаў штыфтаў кругом,
Абсац гладка прыбіў
Дый падкоўку на ём.

Эй, дзівуйся, хто жыў,
Які майстэр я зух,
Бот, камаш, чаравік
Вам састрою ўдруг

І багатбы я быў
(Хоць ня бедзен і так),
Каб лапцей не насіў
Наш мужык—небарак.

Но ён хіба тады
Стане боты насіць,
Як ня будзе с чаго
Лык на лапці лупіць *).

(Гаворэ): Ну, а цяпер годзе ўжо пеяць і трэба ўзяцца за работу. Цяпер трэба правіць боты зарубача... Ох, якжэ ён злупіў абсац! Яшчэ крыху і пачаўбы ўжо на халяве хадзіць!

(бярэцца ізноў за работу і пяе нешта сабе пад нос).

(Далей будзе).

***) Верш Я. Купалы (з „Жалейкі“).**

нак. Карыснасць працы жалезнадарожнікаў паменшылася на ⅓—¼ нормальнай. У ваколіцах паўночнага Донца ёсць 2.086 лішніх чыноўнікаў, катором плоціцца 6½ мільёнаў руб. у год; на палуднёвазаходніх чыгунках—16.000 лішніх служачых, катором плоціцца 46 мільёнаў у год; па ўсей Украіне лішніх чыноўнікаў гэтулькі, што яны разам бяруць у год 200 мільёнаў рублёў, а між імі наглядныя камітэты бяруць 24 мільёны. Дэфіцыт украінскіх чыгунак с прычыны благой гаспадаркі дайшоў 800 мільёнаў рублёў.

## ФІНЛЯНДЗІЯ.

КОПЭНГАГА. Фінляндзкі сайм заседаў першы раз пасьля рэволюціі. Міністэр-прэзыдэнт Свінхувуд дзякаваў Швэціі, Даніі і Норвэгіі за помач. Фінляндзкі народ еў дрэўную кару, каб карміць армію хлебам.

Фінляндзія — незалежная старонка. Зносіны з Расеей разарваны, бо большавікі прызнаюць „чырвоны“ ўрад.

Гр Маннэргэйм прыехаў у сэнат і высказаў жаданьне фінляндзкай арміі, каб Фінляндзія была манархіей.

## ВЕСТКІ З РАСЕІ.

„У Расеі“.

Вядомы палітычны пісьменнік, праф. Ястров, у тыднёвым журналі „Deutsche Politik“ адзначывае, што ў некаторай меры здарэньні ў Расеі з апошняга часу падобны да здарэньняў у Рымскай імперыі ў IV і V сталецьці. У зьвязку з гэтым трэба зьмяніць назовы і дапасаваць да перамяніўшыхся варункаў. Аб „Расеі“ больш нельга гаварыць. Кажучы аб здарэньнях ў межах колішняй царскай Расеі, мы замест слова „Расея“ павінны казаць „Усходняя Эўропа“, або „былая Расейская імперыя“, ці „землі былых расейскіх цароў“. Кажучы аб Вялікарасеі мо' гожэ былоб казарцей казаць аб Маскве: «Масква», або «маскоўскі ўрад згодзіўся на гэта». У кожным прыпадку ужываць імя Расеі дзеля таго, што асталося ад Расеі, было бы абмылкаў як с палітычнага, так географічнага і этнографічнага пагляду.

ШТОКГОЛЬМ. Ленін паслаў усім саветам і ўсімным камітэтам срочную тэлеграму, кажучы, што Пецярбург знаходзіцца ў катастрофальным палажэньні. Хлеба німа. Раздаюцца апошкі хлеба і бульбяной мукі. Сталіца знаходзіцца напярадодні пагібелі. Контррэвалюція паднімае ўжо галаву і падбівае незадаволеные массы проці народных камісараў. «Нашы ворагі стараюцца вымарыць голадам урад саветаў. Толькі дружная праца ўсіх можа тут памагчы і выратаваць Пецярбург. Ад імі соцыалістычнай рэспублікі я прызываю памагчы Пецярбургу.“

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ (Аг. Мілі). Большавікі ў Баку атрымалі значную падмогу с Туркестану і пачалі наступленьне. Мусульмане утрацілі Баку, не гледзячы на помач з Дагестану і Грузіі. Большавіцкіе банды наступаюць далей.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ (В.Т.Б.). Казакі ў ваколіцах Кубані наступаюць на масульман. Большавікі занялі Петровск і стараюцца прарвацца праз яр, які вядзе з Владыкаўказу ў Тыфліс.

ЛОНДОН. Ніжняя палата. Лёрд Сэсіль сказаў:

„Англія заўсёды старалася жыць з Расеей у дружбе і захаваць для Расеі характэр вялікай дзержавы. Расейская ўнутрэная палітыка — гэта справа толькі самае Расеі, і мы да яе не мешаемся. Мы стараемся і на будучыну захаваць саюз з Расеей, а калі гэта немагчыма, дык прынамсі не даць абнямечыцься“.

## З ІРЛЯНДЗІІ.

ЦЮРЫХ. З Ірляндзіі наказываюць, што кіраўнікі с инфэйнэраў Давалера, гр. Маркевіч, Артур Грыфіт, Ділон і Косвэйг — арэштованы.

ДУБЛІН. Урадова. Усе члены парлямэнту, прыналежачые да парты сінэ-файнэраў, арэштованы. У ласьпі знайшлі ў іх многа матэр'ялаў, каторые выкрываюць шырокі плян нямецкай помачы ірляндзкаму паўстаньню. Аднак, чысло замешаных да гэтага — невялікае, і трэба адзначыць, што ірляндзкі народ, як цэлае, да гэтага не замешан.

РОТТЭРДАМ. 18 V. Ірляндзкі віцэ-кароль фельдмаршалак Фрэнч апублікаваў адозву, у каторай між іншым апавешчаецца:

„Некаторые падданые караля завязалі здрадлівые зносіны з Нямеччынай. Павіннасць усіх верных падданых — стаяць у гэтай вайне за свой урад Я аблягчу ірляндзкім падданым магчымасць паступленьня ў армію. Калі чысло ірляндцаў у англіцкай арміі пасьля гэтага будзе пропорцыональным числу жыхароў Ірляндзіі, дык не будзе патрэбным уводзіць у Ірляндзіі прымусовую службу“.

## З усяго сьвету.

ГААГА. Ў Амстэрдаме узьняліся разрухі на вуліцах і бітвы між забастоўшчыкамі і штрэйкбрэхэрамі.

БЭРЛІН (В.Т.Б). 16.V. Перагаворы між нямецкімі і швэйцарскімі паўнамочнікамі аб новай экономічнай умове развязаліся ўдачна. Швэйцарская саюзная рада высказалася за яе ў той аўторак аднадушна. С прычыны неспадзяванага выступленьня французскага пасла умова перад момэнтам уваходу ў сілу ўзята назад. Францускі пасол грэзіў экономічнай вайнай с саюзьнікамі, калі Швэйцарыя падпіша умову. Швэйцарыя папрасіла ў Нямеччыны адлажыць справу да 22 мая. С прычыны грозьб саюзьнікаў Швэйцарыя апынулася ў цяжкім палажэньні. Швэйцарскіе газэты высказываюць незадаволеньне швэйцарскага грамадзянства грозьбамі саюзьнікаў.

БЭРЛІН. Па загаду ўраду емінных спраў, ад 16 чэрвеня порція мукі ў дзень на асобу ў Нямеччыне паменшаецца з 200 да 160 гр Пасьля прывозу транспортаў хлеба з Украіны будзе вернена порція 200 гр.

СОФІЯ. Аўстрыяцкі імператар Кароль з жонкай прыехалі 17 мая ў Софію даведаць баўгарскага цара. На банкеці монархі прамаўлялі, кажучы аб неразрыўнасьці саюза цэнтральных дзержаў.

## ТЭЛЕГРАМЫ.

Нямецкіе апавешчэньні

17.V. Заходні тэатр.

Варожы монітор абстраліваў Остэндэ і зрабіў жыхарам значные шкоды.

На баевых фронтах бітвы толькі на некаторых адрэзках. Ажывіліся разведкі. Мы адбілі сільные англіцкіе атакі на поўначы ад Скарп і пры Бомон Амэль і ўзялі палонных. На поўдні ад Арра—ўдачные разведкі.

Учора зьбіты 18 варожых самалётаў і 1 прывязаны лятучы шар.

18.V. Заходні тэатр.

Слабая чыннасць артылерыі. У начы агонь узмацаваўся. У ваколіцах Лясіні ажывіліся разведкі, даходзіўшые мейсцамі да крываўых штыковых бітв. У розных мясцох узяты палонные.

Учора мы зьбілі 16 варожых самалётаў і 1 прывязаны лятучы шар.

19.V. Заходні тэатр.

На заходзі ад Гульлюш англіцкае наступленьне адбіто с цяжкімі стратамі. У іншых мясцох—разведкі пяхоты. Нашы батарэі між Арра і Альбэр былі пад сільным абстрэлам ворагаў.

20.V. Заходні тэатр.

У ваколіцах Кэмэля чыннасць артылерыі дайшла вялікай сілы. На палудзенным беразі Анкр у досьвітках англічане пасьля сільнага агню пачалі атаку. Яны ўварваліся ў Вілль-сюр-Анкр. Далей іх наступленьне не ўдалося. Новые штурмы проці Морлянкур зламаліся с крывавымі стратамі. У іншых пунктах фронту—жывейшые разведкі, ў часе каторых мы узялі палонных.

У апошнюю ноч Лёндон, Дувр і іншые англіцкіе порты ўдачна абкіданы бомбамі.

## КАЛЯ ВАЙНЫ.

БУДАПЭШТ (В.Т.Б.). У гутарны с карэспандэнтамі газэт нямецкі канцлер гр. Гэртлінг сказаў:

«Я ўсё яшчэ гляджу даволі оптымістычна і веру, што мы яшчэ сёлета дойдзем міра. Найвялікшую надзею я апіраю на тым, што здарэньні на заходзі давядуць да шыбкага канца вайны».

ВЕНА. 16.V. Між Брэнтай і Піавэ адбіты наступленьні італьянцаў дзеля разведкі. На Монтэ Асолёнэ і на Монтэ Пэртіка пры гэтым узьняліся бітвы на штыхі.

ВЕНА. 18.V. Італьянскіе разведкі на палудзенна заходнім фронці ажывіліся.

14 мая перад Валёнай наша падводная лодка затапіла вялікі англіцкі контр-мінаносец

ЦЮРЫХ. С прычыны узросту трывогі грамадзянства ў Італіі с прычыны нестачы спажыўных прадуктаў і вугальля, дый агульнага ваеннага палажэньня, італьянскі ўрад высказаў амэрыканскаму сваё жаданьне, каб амэрыканскіе войскі прыбылі і на італьянскі фронт, бо гэта добра адбілося-бы на настраеньні грамадзянства.

БЭРН (В.Т.Б.). Галоўны рэдактар францускай газэты «Bonnet Rouge», Дювалъ, засуджан на сьмерць, а іншые абвінаемые—ад 5 да 19 гагоў у папраўчы вастрог і штраф за здраду гасударства і прыняцьце нямецкіх грошы.

ЦЮРЫХ. «Züricher Ztg.» даведалася, што перагрупіроўка саюзьніцкіх войск закончана. Ад мора да Діксмуйдэн стаяць бэльгійцы, да Піст—1-я англіцкая армія, да Мэтрэн—французы, да Бэтюн—португальцы і 2-я англіцкая армія, да Арра — 4-я англіцкая армія, да Вільле-Брэтоннэ—астаткі 5 й і 3-й. Далей да швэйцарскай граніцы — французы ў перамешку з амэрыканцамі.

ЖЭНЕВА. Францускае ваеннае міністэрства апавешчае, што францускіе войскі прыбылі на паўночны фронт і занялі адзін з адрэзкаў англіцкага фронту.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Нашы падводные лодкі ў Сярэдземным моры затапілі больш за 25.000 тонн.

БЭРЛІН. Урадова. Ля заходняга узьбярэжжа Англіі затоплены 5 параходаў ёмкасьцю разам 21 000 тонн, у канале Ляманш і ля ўсходняга узьбярэжжа—13.000 тонн.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Урадова. У поясе блокады навакол Англіі нашы падводные лодкі ізноў затапілі 6 параходаў і 2 парусьнікі разам ёмкасьцю 21.000 тонн.





Друкавана у друкарні М. Кухты. Выдавецтва «Гоман» Рэдактар Язэп Салавей.